**М. Л. Кузьмініч,**
*прафесар кафедры псіхалогіі і педагогікі,*
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# КАМПЕТЭНТНАСНЫ ПАДЫХОД У ДЗЕЙНАСЦІ ПЕДАГОГА: ТРАДЫЦЫІ І ІНАВАЦЫІ

На мяжы XX–XXI стст. сістэма адукацыі Беларусі апынулася ў стане бесперапыннага рэфармавання, што адлюстроўвае характэрную асаблівасць стану сучаснага грамадства – яго перманентную трансфармацыю. Гэта звязана з паскарэннем тэмпаў грамадскага развіцця, ростам колькасці і змяненнем характару праблем, з якімі грамадства сутыкаецца, з узмацненнем сітуацыі нявызначанасці і непрадказальнасці працякання грамадскіх працэсаў, са змяненнем рынку працы, інфарматызацыяй грамадскай прасторы і інш.

Калі да сярэдзіны 1990-х гг. змест адукацыі разглядаўся як сукупнасць ведаў, уменняў, вопыту творчай дзейнасці і вопыту эмацыянальна-каштоўнасных адносін, то ў пачатку XXI ст. яго структура дапоўнена ключавымі кампетэнцыямі як метаздольнасцю чалавека жыць у новым свеце, быць гатовым да новых выклікаў часу. Кампетэнцыі ператвараюцца ў аснову фарміравання зместу базавага кампанента школьнай адукацыі. Акцэнт з фарміравання ведаў пераносіцца на здольнасць іх выкарыстоўваць і дзейнічаць самастойна, інтэрактыўна, у сацыяльна-гетэрагенных групах. Усё гэта патрабуе ад сучаснага педагога валодання не проста сукупнасцю прадметных ведаў, уменняў і навыкаў, а здольнасцю іх прымяняць для вырашэння невядомых яшчэ сёння асобасных, сацыяльных і прафесійных праблем. Сярод асобасных якасцей, якія адпавядаюць сучасным выклікам часу, актуальнымі становяцца крэатыўнасць, канструктыўнасць, жаданне і ўменне вучыцца на працягу ўсяго жыцця, дынамізм, талерантнасць, эмпатыя, здольнасць да працы ў камандзе.

У 2007 г. Савет Еўропы і Еўрапарламент распрацавалі агульнаеўрапейскую канцэпцыю асноўных кампетэнцый як водгук на ўзрастаючую інтэрнацыяналізацыю грамадства, хуткія тэмпы змен, на бесперапыннае ўкараненне новых тэхналогій. Упершыню на еўрапейскім узроўні былі вызначаны і апісаны ключавыя кампетэнцыі, неабходныя для паспяховай дзейнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў свеце, які пастаянна змяняецца; кампетэнцыі, неабходныя для рэалізацыі асобасных магчымасцей, далучэння да грамадскага жыцця, праяўлення актыўнай грамадзянскай пазіцыі, для працаўладкавання ва ўмовах грамадства ведаў. Падкрэслівалася значнасць валодання кампетэнцыямі і іх развіцця на працягу ўсяго жыцця.

Катэгорыя «кампетэнтнасны падыход» на постсавецкай прасторы напачатку даследавалася ў дачыненні да навучання. Затым кампетэнтнасны падыход паступова сцвярджаецца і ўкараняецца ў тэорыю і практыку адукацыйнага працэсу, у тым ліку разглядаецца, у прыватнасці, расійскімі навукоўцамі ў кантэксце псіхалогіі працы (А. К. Маркава), арганізацыі педагагічнай дзейнасці (Н. В. Кузьміна), фарміравання асобы педагога (В. А. Адольф). Праблема рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу абмяркоўваецца ў працах В. Я. Лебедзева, І. А. Зімняй, А. В. Хутарскога.

Кампетэнтнасны падыход як спосаб (механізм, погляд, стратэгія, пазіцыя, ідэя) увасаблення абранай той ці іншай педагагічнай парадыгмы выклікаў да жыцця ідэю гуманізацыі адукацыі і адпаведна пабудовы асобасна арыентаванай дыдактычнай сістэмы; гэта ідэя сёння дамінуе. У дадзенай сітуацыі кампетэнтнасны падыход вызначае дыдактычнае рашэнне адукацыйнай асобасна арыентаванай праграмы, задае пэўную норму арганізацыі адукацыйнага працэсу.

У педагагічнай літаратуры найбольшае распаўсюджанне атрымала трактоўка кампетэнтнаснага падыходу ў адукацыі як сукупнасці агульных прынцыпаў вызначэння мэт адукацыі, адбору яго зместу, арганізацыі адукацыйнага працэсу і ацэнкі адукацыйных вынікаў [5; 7; 8; 9; 10]. Сярод іх патрабаванні: 1) развіцця ў вучняў здольнасці самастойна вырашаць праблемы ў розных сферах і відах дзейнасці; 2) выкарыстання настаўнікам у адукацыйным працэсе дыдактычна адаптаванага сацыяльнага вопыту рашэння асобасна і прафесійна значных праблем; 3) стварэння ў адукацыйным працэсе ўмоў для фарміравання вопыту самастойнага рашэння асобасна і прафесійна значных праблем; 4) ацэнкі адукацыйных вынікаў (дасягнутага ўзроўню кампетэнтнасці і адукаванасці навучэнцаў наогул) на аснове іх паэтапнага аналізу.

У сістэме нацыянальнай вышэйшай прафесійнай адукацыі тэрміналогія кампетэнтнаснага падыходу актуалізавалася з



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

распаўсюджаннем ідэй Балонскага працэсу і распрацоўкай у 2007 г. другога пакалення адукацыйных стандартаў першай ступені вышэйшай адукацыі, дзе даецца азначэнне паняццяў «кампетэнцыя» і «кампетэнтнасць», называюцца тры групы кампетэнцый у якасці асноўных мэтавых установак і вынікаў асваення адукацыйнай праграмы ў вышэйшай школе: акадэмічныя, сацыяльна-асобасныя і прафесійныя кампетэнцыі.

У Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі кампетэнтнасны падыход выступае як адно з першарадных патрабаванняў да арганізацыі адукацыйнага працэсу нароўні з забеспячэннем якасці адукацыі, аховай здароўя навучэнцаў, стварэннем адпаведных умоў для іх развіцця. Асноўныя сутнасныя характарыстыкі кампетэнтнаснага падыходу былі прадстаўлены ў публікацыях беларускіх даследчыкаў А. І. Жука, В. Л. Жук, М. І. Запрудскага і інш. [2; 3; 4]. Вопыт яго рэалізацыі ва ўстановах адукацыі абмяркоўваўся на навукова-практычных канферэнцыях [6]. Арыентацыя на фарміраванне кампетэнцый задае іншую логіку арганізацыі асобасна арыентаванага адукацыйнага працэсу – логіку рашэння задач і праблем, аналізу практыка-арыентаваных сітуацый, выкарыстання даследчых і праектных тэхналогій, актыўных і інтэрактыўных метадаў навучання, адпаведных ім форм індывідуальнага, парнага, каманднага, групавога, калектыўнага характару. Галоўнай задачай педагога становяцца матываванасць навучэнцаў, суправаджэнне іх адукацыйнай дзейнасці па «вырошчванні» ў сабе сацыяльна-асобасных, акадэмічных і прафесійных кампетэнцый.

Сапраўдны сэнс рэалізацыі ва ўстановах адукацыі кампетэнтнаснага падыходу заключаецца ў імкненні ўкараніць тэхналогіі кіравання адукацыйным працэсам па яго выніках. Рэалізацыя дадзенага падыходу павінна забяспечыць унутраную матывацыю вучэння, самаарганізацыю навучэнцаў у працэсе вучэбнай дзейнасці, іх самадыферэнцыяцыю (самавызначэнне адносна ўзроўню засваення матэрыялу), дасягненне асобасна значных вынікаў.

Сутнасць кампетэнтнасна-арыентаванага навучання можа быць прадстаўлена сукупнасцю такіх дыдактычных прынцыпаў, як: адбор практыка-арыентаванага зместу вучэбнага матэрыялу; прымяненне прадметных ведаў і ўменняў пры арганізацыі іх засваення; жыццёва-сітуацыйны характар навучання; накіраванасць на фарміраванне ўніверсальных ведаў; матэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыялізацыя вучэбнай дзейнасці; фарміраванне асобасна значных ведаў; падтрымка вучэбнай матывацыі і фарміраванне жыццёвых каштоўнасцей.

Рэалізацыя названых прынцыпаў змяняе месца, ролю, функцыі педагога ў адукацыйным працэсе: яго дзейнасць скіроўваецца на стварэнне сітуацый неабходнасці рабіць выбар з разнастайнасці ідэй, меркаванняў, варыянтаў, заахвочванне ў вырашэнні складаных задач творчага характару, на развіццё матывацыі і настойлівасці. Педагог у рамках кампетэнтнасна-арыентаванага навучання праблематызуе, дыдактычна апрацоўвае прафесійна і жыццёва важныя сітуацыі, задае тэхналогію дзейнасці, суправаджае адукацыйны рух навучэнцаў, г. зн. стварае сітуацыю актывізуючага няведання, падштурхоўвае да стварэння вучнем асабістага адукацыйнага прадукту (ідэй, праблем, гіпотэз, схем, тэкстаў), а таксама сітуацыі неадназначных вучнёўскіх адказаў пры падачы пэўных элементаў тэмы ў форме адкрытых заданняў.

Працэс навучання павінен набыць праблемны характар, забяспечыць актыўную разумовую дзейнасць навучэнцаў. Найбольш эфектыўнымі відамі вучэбнай працы ў рамках кампетэнтнаснага падыходу становяцца праектная, творчая, даследчая.

Педагог у адукацыйным працэсе стварае ўмовы для творчага развіцця навучэнцаў, рэалізуе функцыі забеспячэння іх самаарганізацыі, самакантролю, самаацэньвання, асваення здольнасці выжываць у сучасным свеце, які хутка мяняецца. Тлумачэнне педагогам новага матэрыялу пераўтвараецца ў адкрыццё матэрыялу самімі навучэнцамі. Насычэнне вучэбных заняткаў праблемнымі сітуацыямі забяспечвае развіццё матывацыі да вучэння, фарміраванне ключавых кампетэнцый. Педагог з носьбіта інфармацыі ператвараецца ў каардынатара, арганізатара супрацоўніцтва, кансультанта. Яго дзейнасць накіравана на стварэнне сітуацый неабходнасці рабіць выбар з разнастайнасці ідэй, меркаванняў, варыянтаў, на заахвочванне рашаць складаныя задачы творчага характару, развіццё матывацыі і настойлівасці.

Такім чынам, прафесійная кампетэнтнасць педагога ў сучасных умовах становіцца важнейшым складнікам яго педагагічнага майстэрства. Фарміраванне прафесійнай кампетэнтнасці спецыялістаў, укараненне мадэлі развіцця іх прафесійнай кампетэнтнасці – найважнейшая ўмова павышэння якасці адукацыі ў сучасным грамадстве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Адольф, В. А.* Теоретические основы формирования профессиональной компетентности учителя : автореф. дис. … д-ра пед. наук : 13.00.01 / В. А. Адольф ; Краснояр. гос. ун-т, Лесосиб. пед. ин-т. – М. : МПГУ, 1998. – 48 с.

2. *Жук, А. И.* Роль образования в инновационном развитии страны / А. И. Жук // Вышэйшая школа. – 2010. – № 3. – С. 4–8.

3. *Жук, О. Л.* Педагогическая подготовка студентов: компетентностный подход / О. Л. Жук. – Минск : РИВШ, 2009. – 336 с.

4. *Запрудский, Н. И.* Современные школьные технологии-2 / Н. И. Запрудский. – Минск : Сэр-Вит, 2010. – 251 с.

5. *Зимняя, И. А.* Ключевые компетентности как результативно-целевая основа компетентностного подхода в образовании: авторская версия / И. А. Зимняя.– М. : Исслед. центр проблем качества подготовки специалистов, 2004. – 38 с.

*6.* Компетентностный подход в образовании: история и современность: тез. докл. Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 16–17 апр. 2013 г. / гл. ред. Т. И. Мороз. – Минск : МГИРО, 2013. – 152 с.

*7.* Компетенции в образовании: опыт проектирования : сб. науч. тр. / под ред. А. В. Хуторского. – М. : ИНЭК, 2007. – 328 с.

8. *Кузьмина, Н. В.* Профессионализм личности преподавателя и мастера производственного обучения / Н. В. Кузьмина. – М. : Высш. шк., 1990. – 119 с.

9. *Лебедев, О. Е.* Компетентностный подход в образовании / О. Е. Лебедев // Школьные технологии. – 2004. – № 5. – С. 3–12.

10. *Маркова, А. К.* Психология труда учителя : кн. для учителя / А. К. Маркова. – М. : Просвещение, 1993. – 192 с.

**Л. Е. Кульбицкая,**
*доцент кафедры общенаучных дисциплин Института предпринимательской деятельности, кандидат философских наук, доцент*

# РОЛЬ СОЦИАЛЬНО-ГУМАНИТАРНОГО ЗНАНИЯ В СОВЕРШЕНСТВОВАНИИ КОМПЕТЕНТНОСТНОГО ПОДХОДА В ВЫСШЕМ ОБРАЗОВАНИИ

Повышение качества подготовки специалистов в современном обществе предполагает модернизацию высшего образования с целью достижения новых образовательных результатов, адекватных современным требованиям. Модернизация в значительной степени обусловлена тем, что образовательные про-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ